# Весці

**БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ПЕДАГАГІЧНАГА УНІВЕРСІТЭТА**

## № 2 (24) 2000

**Штоквартальны навукова-метадычны часопіс**
**Выдаецца з чэрвеня 1994 г.**

***Галоўны рэдактар:***
Л. Н. Ціханаў

***Рэдакцыйная калегія:***
Н. Г. Алоўнікава
Г. А. Баўтута
В. А. Бондар (*нам. галоўнага рэдактара*)
Ю. А. Быкадораў (*нам. галоўнага рэдактара*)
А. М. Вітчанка
К. У. Гаўрылавец
А. А. Гіруцкі
Т. А. Грыгор'ева
Я. Л. Каламінскі
Л. А. Кандыбовіч
Г. А. Космач
І. А. Новік
А. У. Рагуля
М. Т. Стэльмашук
В. М. Фамін
А. Т. Федарук
А. В. Фіялкоўская (*адказны сакратар*)
І. І. Цыркун
Л. Б. Шнеперман
У. А. Якавенка
М. С. Яўневіч

## ЗМЕСТ

*Педагогіка*

*Савушкіна А. В.* Дзіцячы рух: погляд у мінулае ........ 3

*Алоўнікава Н. Г., Анікіевіч А. М.* Выкарыстанне лінгвакраіназнаўчай методыкі на занятках замежнай мовы на спецыяльных факультэтах педагагічнай ВНУ ........ 8

*Василяускас Р. А.* Культурологический и исторический подходы в изучении литовской народной педагогики ........ 12

*Псіхалогія*

*Плаўнік Н. К.* Крызіс самавызначэння ў раннім юнацкім узросце ў святле культурна-гістарычнай тэорыі ..... 17

*Сотнікава Т. А.* Аб сямейных псіхатраўміруючых фактарах дзяцінства ........ 20

*Філасофія*

*Мартынаў М. І., Навагродскі В. Я.* Асаблівасці працэсу сацыялізацыі моладзі ў сучасных умовах ........ 28

*Мовазнаўства*

*Рагаўцоў В. І.* Сінонімы як сродак стварэння камічнага эфекту ў беларускай драматургіі ........ 34

*Бунцевич Л. М.* Распространенность и функционирование прилагательных с без- (*bez-) в русском и белорусском языках ........ 39

*Мормыш Л. С.* Белорусизмы в переводных текстах произведений М. Горецкого ........ 45

*Літаратуразнаўства*

*Ганчарова-Цынкевіч Т. У.* Вобраз Мадонны ў творчасці Максіма Багдановіча ........ 51

*Тычка Г. К.* Польская культурная традыцыя і Янка Купала ........ 56

*Логвин Т. М.* К проблеме диалога национальных культур ........ 61

*Дынько А. В.* Выкарыстанне мадэлі лабірынта ў рамане Джона Фаўлза «Маг» ........ 66

*Студенко Т. С.* Идеи трансцендентализма и американского романтизма в творчестве Г. Джеймса ........ 70

*Музыказнаўства*

*Яшчанка В. М.* Пра часавую прымеркаванасць карагодаў Магілёўшчыны ........ 77

УДК 947.085

БФТУ+ЗКМ(3)+9(С3)27

*А. А. Каваленя*

# ПАТРЫЯТЫЧНЫ РУХ БЕЛАРУСКАЙ МОЛАДЗ… Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ (1941—1945 гг.)

У апошні час з'явілася нямала публікацый, у якіх дасле… пераасэнсоўваюць падзеі другой сусветнай вайны. У шэрагу … некаторыя аўтары нават імкнуцца прынізіць уклад Чыр… Арміі і партызан Савецкага Саюза ў разгром нацысцкай Герм…

Аб'ектыўны аналіз сведчыць пра адваротнае. У літар… шматлікіх архіўных дукументах існуюць звесткі, якія пацв… юць, што Савецкі Саюз вынес на сабе ўвесь цяжар вайны. … і яго армія адыгралі рашаючую ролю ў разгроме нацысцкай … маніі і мілітарысцкай Японіі. Статыстыка сведчыць, што … вецка-германскім фронце было сканцэнтравана ад 190 да 27… візій краін фашысцкага блока. Падкрэслім, што англа-амер… скім войскам у перыяд другой сусветнай вайны працістаялі: у … ночнай Афрыцы — 8—20 дывізій Германіі і Італіі; у Зах… Еўропе — звыш 70 германскіх і італьянскіх дывізій. За час … савецкія войскі разграмілі і ўзялі ў палон 607 дывізій краін … раўскага блока, а войскі саюзнікаў толькі 176 дывізій фашы… Італіі і нацысцкай Германіі. Як бачна, перавага відавочная.

Значны ўклад у разгром нацысцкай Германіі ўнёс бела… народ. Каля 1,5 млн. беларусаў змагалася на франтах Вя… Айчыннай вайны. 374 тыс. беларускіх партызан і 80 тыс. … польшчыкаў тры гады вялі ўпартую барацьбу з германскімі … нікамі, яшчэ каля 400 тыс. знаходзілася ў партызанскім рэзер…

У артыкуле на аснове аўтарскай даследчай практыкі роб… спроба ў абагульненым выглядзе паказаць патрыятычны ру… ладзі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Пачатак ваенных падзей летам 1941 г. няўдала склад… для войск Чырвонай Арміі. На заходніх беларускіх рубяжа… міі цярпелі паражэнні, з кровапралітнымі баямі адступал… ўсход, многія былі разбіты. Аднак нават у надзвычай склад… абставінах народ выступіў на абарону сваёй Бацькаўшчыны.

У барацьбе актыўна ўдзельнічалі беларускія юнакі і … чаты. Па заклiку ЛКСМБ каля 85 тыс. камсамольцаў уступ… ў рады дзеючай арміі.

У айчыннай гістарыяграфіі зацвердзілася лічба 130 тыс. … самольцаў, якія ўступілі ў дзеючую армію. Такая колькасц…

дпавядае рэальнасці. На 01.06.1941 г. у радах ЛКСМБ налічвалася 264 621 чалавек. З іх: 150 950 — жаночая моладзь, 50 000 — школьнікі, якія не падлягалі прызыву; 35 000 — камсамольцы заходніх раёнаў, дзе мабілізацыя не праводзілася. Сюды неабходна дадаць хворых, а таксама асоб, якія ўхіляліся ад прызыву. Наша даследаванне паказвае, што ў рады Чырвонай Арміі па прызыву і дабраахвотна ўступіла каля 85 тыс. камсамольцаў [2]. Дзесяткі тыс. юнакоў і дзяўчат, якія не былі прызваны ў Чырвоную Армію, ішлі працаваць на прамысловыя сельскагаспадарчыя прадпрыемствы, замянялі пайшоўшых на фронт бацькоў і братоў. У свабодны ад асноўнай працы час яны дзяжурылі ў камсамольска-маладзёжных дружынах проціпаветранай і проціхімічнай абароны, аддавалі свае сілы на будаўніцтве абарончых збудаванняў. Многія з іх сталі членамі санітарных дружын, з'яўляліся памочнікамі медыцынскага персаналу бальніц і шпіталяў, ратавалі раненых і акружэнцаў, перапраўлялі іх у савецкі тыл, хавалі ад ворага на месцы.

Камсамольцы і моладзь складалі больш за палову байцоў у народна-апалчэнскіх фарміраваннях. Разам з воінамі Чырвонай Арміі яны самаахвярна абаранялі гарады і вёскі Беларусі. У складанейшых абставінах ваеннага часу ЛКСМБ перабудоўваў сваю дзейнасць.

У рабоце яго кіруючых органаў, асабліва ў пачатковы перыяд вайны, былі дапушчаны сур'ёзныя памылкі і пралікі, якія былі выкліканы шэрагам аб'ектыўных і суб'ектыўных прычын.

Нягледзячы на цяжкія абставіны, на акупіраванай тэрыторыі Беларусі разгортваўся стыхійны ўздым моладзі супраць германскіх акупантаў, уласцівы як для заходніх, так і ўсходніх раёнаў рэспублікі.

Ужо ў першыя месяцы вайны ў заходніх рэгіёнах узнікла не менш чым 110 падпольных камсамольска-маладзёжных арганізацый. Яшчэ больш актыўна змагалася моладзь усходніх рэгіёнаў. Толькі ў Віцебскай вобласці для падпольнай работы былі пакінуты 10 сакратароў райкомаў камсамола і 3 186 камсамольцаў. Усяго для арганізацыі нелегальнай дзейнасці былі астаўлены камсамольскія функцыянеры, загадзя створана 1400 нелегальных арганізацый, якія аб'ядноўвалі каля 5 тыс. камсамольцаў.

Камсамольска-маладзёжнае падполле пашыралася і сваім уплывам ахапіла большасць беларускай моладзі (табліца).

*Таб*

**Стан развіцця патрыятычнага падполля**

| *Вобласць* | *Абкамы* | *ГК, РК, міжрайкамы, міжрайцэнтры* | *Колькасць арганізацый у партызанскіх атрадах* | *Колькасць у іх камсамольцаў* | *Колькасць тэрытарыяльных падпольных арганізацый* | *Колькасць у іх падпольшчыкаў* |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. Баранавіцкая | 1 | 33 | 170 | 4082 | 214 | 812 |
| 2. Беластоцкая | 1 | 23 | 96 | 1115 | 279 | 1511 |
| 3. Брэсцкая | 1 | 19 | 70 | 2503 | 283 | 1037 |
| 4. Вілейская | 1 | 21 | 217 | 4828 | 45 | 425 |
| 5. Віцебская | 1 | 21 | 533 | 9023 | 814 | 3186 |
| 6. Гомельская | 1 | 16 | 59 | 3368 | 253 | 833 |
| 7. Магілёўская | 1 | 23 | 266 | 7543 | 266 | 890 |
| 8. Мінская | 1 | 30 | 900 | 11178 | 536 | 8557 |
| 9. Палеская | 1 | 76 | 193 | 2416 | 59 | 175 |
| 10. Пінская | 1 | 12 | 75 | 2068 | 185 | 1364 |
| Усяго | 10 | 274 | 2579 | 48124 | 2934 | 18790 |

Варта падкрэсліць, што пад уплывам разгорнутай агітацы... прапагандысцкай работы, баявой і дыверсійнай дзейнасці ... дых падпольшчыкаў хутка раслі рады партызан. Прычым ... ная большасць беларускіх партызан, у прыватнасці іх баяз... ны асяродак, складаўся з моладзі. Былі створаны спецыял... камсамольска-маладзёжныя фарміраванні. Так, на акупіра... тэрыторыі Беларусі дзейнічала 7 камсамольска-маладзёжных ... гад і 28 атрадаў. Архіўныя крыніцы сведчаць, што з 374 ты... ларускіх партызан юнакі і дзяўчаты да 26-гадовага ўзросту ... далі 55% [4].

Камсамольцы і моладзь стаялі ля вытокаў ваенна-ба... пачынанняў. Па ініцыятыве камсамольскіх камітэтаў у атр... разгарнулася спаборніцтва за авалодванне партызанамі ва... вымі спецыяльнасцямі. Напрыклад, у Віцебскай вобласці ... падрыхтавана 2 727 падрыўнікоў, 778 знішчальнікаў та... 2 635 кулямётчыкаў, 632 мінамётчыкі, 2 041 аўтаматч... 283 снайперы, 312 санінструктараў [4]. Вялікая ўвага ўдзял... падрыхтоўцы дыверсантаў.

Усяго за лета 1944 г. іх было абучана: у Мінскай вобл... 4 100, Магілёўскай — 2 950, Гомельскай — 2 600, Баран... кай — 1 180, Брэсцкай — 570, Беластоцкай — 1 080, а ў В... скай — 10 000.

З ліку падрыхтаваных спецыялістаў ствараліся камсамол... маладзёжныя дыверсійныя групы. У Магілёўскай вобласц...

алічвалася звыш 350, у Віцебскай — 263, у Гомельскай — 209. Усяго на акупіраванай тэрыторыі дзейнічала 2 447 камсамольска-маладзёжных дыверсійных груп, якія ажыццявілі шмат дывер-ій на чыгунках, шасейных дарогах і іншых камунікацыях вора-а [6, с. 141].

Камсамольцы і моладзь стаялі ў авангардзе барацьбы з гер-анскімі агрэсарамі. На чале падрыўной справы ў брыгадзе імя . Я. Варашылава, што дзейнічала ў Капыльскім раёне, стаяў амсамолец Міхаіл Дурасаў. На яго рахунку было 8 падарваных эшалонаў ворага. Сапраўднымі майстрамі падрыўной справы яўляліся Фёдар Бачыла, які падарваў 23 эшалоны, Павел Ка-кушка — 27, Уладзімір Парахневіч — 20 ды інш.

За тры гады барацьбы маладыя патрыёты Беларусі падарвалі 800 варожых цягнікоў, 70 тыс. чыгуначных рэек, узарвалі спалілі 3 тыс. мастоў, знішчылі 233 склады, 200 танкаў і бро-емашын, больш за 100 трактароў, каля 4 тыс. аўтамабіляў, па-шкодзілі 17 самалётаў і больш за тысячу кіламетраў тэлефонна-элеграфнай сувязі [8, с. 8].

Важным напрамкам барацьбы з'яўлялася агітацыйна-прапа-андысцкая і масава-палітычная работа, разгорнутая на акупіра-анай тэрыторыі. У Мінскай вобласці сярод насельніцтва партызан яе вялі звыш 2,5 тыс. маладых агітатараў, у Магілёў-кай — каля 2 тыс. Больш за 100 груп агітатараў праводзілі ас-тніцкую работу ў Баранавіцкай вобласці. Камсамольцы і мо-адзь Віцебскай вобласці распаўсюдзілі каля 600 тыс. лістовак, тым ліку 170 тыс. былі напісаны ад рукі. Звыш 350 тыс. экз. ет і лістовак распаўсюджаны ў варожых гарнізонах. У Брэсц-й вобласці надрукавана 76 700 лістовак, якія выкрывалі варо-ю прапаганду, і 119 800 экз. зводак Савецкага інфармбюро [5, 90—93].

Выкладзены матэрыял яскрава паказвае. што маладое пака-нне Беларусі ў гады суровых выпрабаванняў знаходзілася ў нгардзе барацьбы з германскімі агрэсарамі.

### ЛІТАРАТУРА, КРЫНІЦЫ

1. Великая Отечественная война. 1941—1945: Энциклопедия. 1985. С. 190—193.

2. НА РБ. Ф. 63. Воп. 1. Спр. 149, 154; Воп. 15. Спр. 86; 16. Спр. 1—2.

3. Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашист-их захватчиков в годы Великой Отечественной войны. Мн, 3. Т. 1. С. 95—103.

4. *Каваленя А. А.* Прагерманскія саюзы моладзі на Беларусі. 1—1944. Вытокі. Структура. Дзейнасць. Мн., 1999. С. 8.

5. НА РБ. Ф. 63. Воп. 6. Спр. 78. Л. 3; Воп. 16. Спр.
Л. 498—503.
6. *Аблова Р. Г.* Это было в Белоруссии. М., 1957. С. 169.

*SUMMARY*

*The movement of young patriot organizations in Belarus during the Great Patriotic War is described in the article. It is proved that Generation was in ranguard of struggle against aggressors.*

УДК 947.085

*В. І. Ермаловіч*

Бр124+9(с3)47

# ТРАГІЧНЫ ЛЁС БЕЛАРУСКАГА СЯЛЯНСТВА Ў ГАДЫ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

Палітыка генацыду, якая праводзілася нямецкімі акупацый-нымі ўладамі ў адносінах да беларускага і іншых народаў СССР у гады вайны (1941—1944 гг.) з'яўляецца вынікам загадзя спла-нованага злачынства з боку гітлераўскага ўрада. Так, імперскі камісар па кансалідацыі нямецкага народа рэйхсфюрэр Г. Гімлер у службовай запісцы «Аб некаторых думках пра адносіны да мясцовага насельніцтва ўсходніх абласцей», падрыхтаванай у 1940 г. для ўрада Германіі, паведамляў, што важнейшай справай усходняй палітыкі з'яўляецца ачышчэнне далучаных да Рэйха тэрыторый на Усходзе (СССР. —*В. Е.*) ад асоб «чужой расы». Пры ажыццяўленні каланізацыі і знішчэння славянскіх народаў ён патрабаваў не лічыцца з абставінамі, выкарыстоўваць сілу і ісці напралом.

Гітлераўскі ўрад яшчэ напярэдадні вайны заклікаў салдат і афіцэраў праяўляць лютыя адносіны да насельніцтва СССР. Пра гэта яскрава сведчыцца ў § 2, пункта 1 загаду «Аб выкарыс-танні ваеннай юрысдыкцыі ў раёне “Барбароса” і аб асобых ме-рапрыемствах у войсках» ад 13 мая 1941 г. за подпісам начальніка Галоўнага штаба ўзброеных сіл Германіі, генерал-фельдмаршала В. Кейтэля. У ім паведамлялася: «За дзеянні, учыненыя ваеннаслужачымі супраць варожых грамадзянскіх асоб, не існуе ніякага прымусовага праследавання нават у тым выпадку, калі дзеянні з'яўляюцца адначасова ваенным злачынствам або правапарушэннем» [2, с. 362]. Загады такога роду супярэчылі нават прымітыўным разважанням аб праве і гуманізме. Разумела гэта і кіраўніцтва нямецкай арміі. Яно прымала ўсе меры, каб на-званыя дакументы не трапілі ў рукі праціўніка. У канцы лі